ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
2
КРАСАВІК
ЧАЦВЕР
№ 12(1533)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### Адбыўся III пленум

камітэта камсамола універсітэта. На пленуме прысутнічалі: рэктар БДУ Л. І. Кісялеўскі, намеснік сакратара парткома А. М. Рухля, старшыня прафкома студэнтаў А. Д. Кішкевіч, дэканы, сакратары камітэтаў камсамола факультэтаў, іх намеснікі па вучэбнай рабоце. З дакладам «Аб удзеле камсамольскіх арганізацый універсітэта ў ажыццяўленні рэформы вышэйшай школы і развіцці самакіравання» выступіў намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па вучэбнай рабоце А. Русаковіч.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел: С. Барытко, П. Жушма, С. Балашэнка, Л. Галавач, І. Ганчаронак, Ю. Позняк, В. Малафееў, А. Каханоўскі. На пленуме выступілі Л. І. Кісялеўскі і дэкан ММФ Л. П. Прымачук.

Пленум даручыў бюро камітэта камсамола універсітэта падрыхтаваць канчатковую рэдакцыю «Палажэння аб студэнцкім самакіраванні ў Белдзяржуніверсітэце» з улікам выказаных прапаноў і рэкамендаваў яго для зацвярджэння на сумесным пасяджэнні рэктарата і студэнцкага актыву.

Н. ГУЛЕЙЧЫК.

### Лясная паляна,

палатка, касцёр. Увага прысутных звернута на чалавека з гітарай. Ці не праўда, знаёмая сітуацыя?

У цяперашні час самадзейная песня набывае ўсё большую папулярнасць і новых прыхільнікаў. Напрыклад, два месяцы назад адбыўся І Усесаюзны фестываль самадзейнай песні, з'явіліся новыя выканаўцы, выходзяць пласцінкі, тэле- і радыёперадачы, адкрываюцца клубы самадзейнай песні.

Ствараецца такі клуб і ў нас, ва універсітэце. Туды змогуць прыйсці усе, хто спявае, іграе, складае ці проста неабыякавы да гэтага жанру. А дакрануўшыся да гэтага хвалюючага віду мастацтва аднойчы, думаю, ніколі не пажадае развітацца з ім.

За даведкамі аб стварэнні КСП звяртацца ў камітэт камсамола.

А. СУПРУНОВА.

### Літаб'яднанне «Узлёт»

праводзіць у інтэрнаце № 7 (па вуліцы Кастрычніцкай) вечар-конкурс маладых паэтаў. Вечар адбудзецца 4 красавіка ў 19.00. Запрашаем усіх аматараў паэзіі.

А. САЎЧЫК.






ВЫСЛУХАЎШЫ ЎСЕ ПАРАДЫ І ВІНШАВАННІ, ЕН ТРЫВАЛА АСТАЛЯВАЎСЯ Ў КАБІНЕЦЕ ДЭКАНА, СВАБОДНА

## КАЛІФ НА ДЗЕНЬ?





АРЫЕНТУЕЦЦА Ў ТЭЛЕФОНАХ І КІРАЎНІЦКІМ АПАРАЦЕ. АД ЯКОГА ЗАЛЕЖЫЦЬ ЖЫЦЦЕ ЎСЯГО ФАКУЛЬТЭТА.

ЗРАЗУМЕЛА, НЕ-НЕ ДЫ ЗІРНЕ ЕН НА ЎСЕ, ШТО АДБЫВАЕЦЦА ВАЧЫМА СТУДЭНТА. ВЯСЕЛЫМІ. ІРАНІЧНЫМІ. СВАЕ ЧАСОВАЕ ПЕРАЎТВАРЭННЕ ПАРАЎНОВАЕ З УЛАДАЙ КАЛІФА, ХОЦЬ І НЕ НА ГАДЗІНУ... АЛЕ, ЖАРТЫ ЖАРТАМІ, А ВАЦЛАЎ БАГДАНОВІЧ НА УЛАСНЫМ ВОПЫЦЕ ЗМОГ АДЧУЦЬ: ДЗЕНЬ ДУБЛЕРА — НЕ СВЯТА СТУДЭНЦКАГА НЕПАСЛУШЭНСТВА, А СУР'ЕЗНЫ ЭКЗАМЕН НА САМАСТОЙНАСЦЬ.

ТАМУ ТАКІ ЗАКЛАПОЧАНЫ СХІЛІЎСЯ НАД ПАПЕРАМІ, ЗАСТАЎШЫСЯ САМ-НАСАМ ДЭКАН-ДУБЛЕР. ХВАЛЮЕЦЦА, ГЛЕДЗЯЧЫ Ў АКНО САПРАЎДНЫ ДЭКАН ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ АЛЕГ ГЕОРГІЕВІЧ СЛУКА. ДУБЛЕР ПАЧЫНАЕ ДЗЕЙНІЧАЦЬ. ЯКУЮ АДЗНАКУ ЕН АТРЫМАЕ?

### Ад першай асобы

У ВОСЕМ гадзін раніцы прыишоў на факультэт і нават крышачку няёмка стала: пуста, ціха, бязлюдна. У аўдыторыях блішчаць вільгаццю падлогі, у сталоўцы — ні душы, толькі за сваім сталом адзінока сядзіць вахцёр.

Аддаю апошнія распараджэнні свайму намесніку Сяргею Зайцу. Раз-пораз кідаю позірк на гадзіннік: стрэлкі хутка адлічваюць мінуту за мінутай. Ужо дваццаць мінут дзевятай. А заняткі пачынаюцца ў 8.30. Няўжо ніхто не прыйдзе?

Як адказ на пытанне — прарэзліва рыпаюць дзверы. Першай пераступае парог факультэта студэнтка другога курса Аня Раманоўская. З іроніяй да сябе падумаў: «Хоць адзін падначалены будзе». Раптам цішыню ўзрывае смехам, жартамі вясёлы натоўп. На хаду распранаючыся, студэнты спяшаюцца на заняткі. Я таксама іду на сваё працоўнае месца — ў кабінет, займаю крэсла дэкана. Заклікальна звініць тэлефон: з рэктарата цікавяцца, як ідуць справы. Бадзёрым голасам паведамляю, што ўсё добра, усё па плану. Толькі паклаў трубку — зноў званок, другі, трэці. Не паспеў адказаць, як нехта настойліва грукнуў у дзверы і адразу з парога пачаў: «Што гэта за самакіраванне? Мой дублёр не з'явіўся на лекцыю». Па спіне прабягае халадок, разрываецца тэлефон. Хочацца пабегчы за сапраўдным дэканам. Выратоўвае чацвертакурсніца Ірына Кезік (яна выконвае ролю дыспетчара).

Нарэшце перапынак. Па старой студэнцкай звычцы спяшаюся ў калідор. Куды там! У кабінеце ўжо з добры дзесятак наведвальнікаў:

— Мне б падпісаць заяву...

— Вы абяцалі вырашыць пытанне са стыпендыяй...

— А як наконт вольнага наведвання?

Адказваю адразу на некалькі пытанняў, падпісваю паперы, на тэлефон паглядаю, як на ворага...

Цяжка быць дэканам. Не згаджаецеся? Тады атрымайце інфармацыю для разважання: за восем гадзін свайго незвычайнага працоўнага дня прыняў 65 наведвальнікаў, падпісаў звыш трох дзесяткаў дакументаў, больш як гадзіну змагаўся з тэлефонам. І нарэшце самае незвычайнае і цяжкое — на «вясёлым перапынку» першы раз у жыцці давялося станцаваць вогненную «Цыганачку». Многа яшчэ ў гэты дзень давялося рабіць упершыню: загадваць, караць, узнагароджваць, быць дыпламатам... Так, сапраўды дэканам быць цяжка.

### Даверылі — дзейнічай

Вельмі не хапала самастойнасці, умення працаваць з людзьмі, дзелавітасці, аператыўнасці ў дзеяннях. Проста арганічна не хапала! Але галоўнае — усё ж удалося даказаць сваё права на самастойнасць. Так атрымалася, што аб ёй гавораць шмат і ў рэктарацэ, і ў дэканаце. Толькі студэнцкая аўдыторыя яшчэ маўчыць. І гэта незразумела, бо мы ж павінны лепей ведаць свае праблемы. А што такое самастойнасць студэнтаў? Не толькі акуратнасць наведвання лекцый і семінараў. Перш за ўсё, гэта ўменне самому кіраваць навучальным працэсам, жаданне займацца самаадукацыяй. Дзень дублёра і дапамог нам адчуць адказнасць за даручаныя справы, за саміх сябе і сваё будучае.

В. БАГДАНОВІЧ, дэкан-дублёр, студэнт III курса факультэта журналістыкі.



Удзельнічаючы ў 1987 годзе ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве, калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна ў другі год дванаццатай пяцігодкі прымае наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:

1. Выканаць планы прыёму і выпуску спецыялістаў па дзённай, вячэрняй і завочнай формах навучання і па аспірантуры.

2. Абараніць 7 доктарскіх і не менш 80 кандыдацкіх дысертацый.

3. Падрыхтаваць да выдання і надрукаваць не менш чым 22 падручнікі і вучэбныя дапаможнікі і 240 метадычных распрацовак.

4. Дамагчыся, каб колькасць дыпломных работ студэнтаў дзённай формы навучання, якія рэкамендаваны да ўкаранення і друку, склала не менш 38 працэнтаў.

5. Выканаць НДР на агульную суму не менш 17,9 мільёна рублёў. Атрымаць эканамічны эфект ад укаранення НДР не менш чым 22 мільёны рублёў.

6. Арганізаваць і правесці 20 універсітэцкіх навуковых і навукова-метадычных канферэнцый.

7. Працягваць распрацоўку навуковых тэм, якія звязаны з рэалізацыяй Харчовай праграмы СССР. Для аказання непасрэднай дапамогі сельскай гаспадарцы рэспублікі накіраваць на сельскагаспадарчыя работы не менш 1500 студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў у падшэфны саўгас «Гарадок» Уздзенскага раёна і калгас імя Ульянава.

8. Прадставіць у Дзяржкамітэт па адкрыццях і вынаходніцтвах не менш 335 заявак і атрымаць на раней пададзеныя заяўкі не менш 220 станоўчых рашэнняў.

9. Прадставіць на Усесаюзны і Рэспубліканскі конкурсы не менш 250 студэнцкіх работ.

10. Падрыхтаваць да друку не менш 290 артыкулаў у сааўтарстве са студэнтамі.

11. Падрыхтаваць не менш 3400 дакладаў студэнтаў на навуковых канферэнцыях.

# САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ КАЛЕКТЫВУ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА НА 1987 ГОД

12. Забяспечыць падрыхтоўку на ФГП не менш 1600 студэнтаў.

13. Сфарміраваць зводны студэнцкі будаўнічы атрад колькасцю не менш 1800 чалавек. Асвоіць сіламі зводнага студэнцкага атрада не менш як 2,5 мільёна рублёў капіталаўкладанняў.

14. Арганізаваць і правесці 23 паходы моладзі, выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа з удзелам у іх не менш 230 чалавек.

15. Прачытаць для насельніцтва 6400 лекцый на грамадска-палітычныя і навуковыя тэмы.

16. Падрыхтаваць 5 майстроў спорту, 25 кандыдатаў у майстры спорту, не менш 90 спартсменаў I разраду і не менш 5000 спартсменаў масавых разрадаў.

17. Падрыхтаваць не менш 2300 значкістаў комплексу ГПА.

18. Выканаць наменклатурныя мерапрыемствы па ахове працы на суму 30 тысяч рублёў.

19. Прарабіць на сэканомленай электраэнергіі адзін дзень.

20. Выканаць падрыхтоўчыя работы і адкрыць піянерскі лагер для адпачынку ў летні перыяд 300 дзяцей супрацоўнікаў.

21. Пастаянна паляпшаць ахову здароўя і ўмовы адпачынку выкладчыкаў і супрацоўнікаў, забяспечваючы знаходжанне ў прафілакторыі БДУ 20 чалавек у змену.

Сацыялістычныя абавязацельствы прыняты на канферэнцыі працоўнага калектыву Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна 13 сакавіка 1987 года.

# РУЖОВЫ РАНАК

ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

## Галіна Ракоца



### СМАГА

*Вастрэй пякельнага агню апёк смыліць,—*
*Чужому — ды чужое — не баліць...*
*Узмылены, конь прагне вадапою.*
*І стомленая птушка просіць піць.*
*І не спытай, як трызніла табою:*
*Ва ўласнай студні — ды ваду муціць?*
*...Ты, пэўна, гэтага жадаў,*
*Што кубак мне пусты падаў?!*

## Жанна Паходня



### ПЯТАЯ СЦЕНКА

У пакоя з'явілася пятая сценка —
З цэглы кніжнае.
(Замест акна).
Лішняя?
Не навіна —
Выстаўка розуму?
...Мяркуюць па-рознаму.
У пакоя з'явілася пятая сценка:
Я — інтэлігентка.

У спакоі з'явілася пятая сценка —
Надзейнаю
Перастрахоўкай падзенняў.
Не мною прыдумана!
Поле думак засеяна
Чужымі думкамі.

Выстаўка розуму —
Сценка пятая!
Месца для роздуму
Ёю занятае.
...Пятая сценка —
Замест акна...
А раптам яна — мана?..

### ДЗЕД

Ягоныя валасы — пад колер попелу:
Жыццё ледзь тлее
Вугельчыкамі вачэй.

### ЧАРАДЗЕЙНАЯ СІЛА

Галаву сваю ў самай нямілай
Пакачай у злы час на плячы...
Раз я ўласную голаў згубіла:
Дай тваю — памагу валачы!

Ох, я ўласную голаў згубіла
Недзе ў цемені майскай начы,
А надзея... зусім не свяціла...
Хай пасвеціць — тваю зберагчы!

Галаву сваю ў самай нямілай
Пакачай у злы час на плячы:
Ёсць у тым чарадзейная сіла,
Каб маю безгаловасць лячыць!

## Алесь Бадак

Тады нас
Праклялі
Нянавісць
І любоў,
Каб мы ужо
Не змаглі
З табой
Сустрэцца зноў.
Не тое што
Крычаць,
Паплакацца
Услых,
А нават
Памаўчаць
Няма пра што
Удваіх.

* * *

Абняла і прамовіла ціха:
— Можа, мы не ўбачымся больш.
Ну куды ты? Пабудзь яшчэ
крыху!

І хіснулася лесвіца ўбок.
І дарога ўпіралася ў дом
Без цябе столькі часу
як змог?!

Дацягнуўся да выхаду моўчкі
І дарогу разгледзеў ля ног.
І дарога ўпіралася ў дом
Не пачаткам сваім, а канцом.

## Пятрусь Ахрэмчык

### МОЙ ВЕРШ

*Вазьму я з матчынай песні мелодыю,*
*З бабулінай казкі — гучную мову,*
*З народных паданняў пазычу свабоды,*
*І вернасці ў Янкі роднаму слову,*
*А звонкасць вазьму ў шумнай крыніцы,*
*У бярозак вясёлага гоману трохі,*
*Празрыстасці светлай — у азёрнай вадзіцы*
*І, набраўшы народнай мудрасці крохі,*
*Праз сэрца іх свае прапусціўшы,*
*Адзінае цэлае зліць пастараюся,*
*І душою родную мову адчуўшы,*
*Я толькі тады з паперай параюся.*



### МАКСІМУ БАГДАНОВІЧУ

Вечар добры, Максім,
Зноў, самотны, з табой
Я у парку тваім
І у сэрцы з нудой.

Аднагодак ты мой,
А колькі ж паспеў!
Гартаваны верш твой,
Як той звон зазвінеў!

Ты панам даказаў —
Беларусь існуе;
Мову ўсім паказаў
У вялікай красе.

Ты рандо і раманс
Беларусам прынёс,
Аднак кінуў ты нас...
Недарэчны твой лёс!

Але сказ твой жывы
Абуджае людзей,
Маладым ды сівым
З імі ісці весялей.
Ты ў сэрцы жывеш,
Ты — з народам сваім.
Ты, песняр, не памрэш!
Вечар добры, Максім.





Фотаэцюд С. ЛАЙКОЎСКАГА.

## Андрэй Гуцаў

### ВЕЦЕР: СТЫХІЙНАЕ

В ничто прошедшее не канет.
Грядущее досрочно манит.
Гётэ.

Апалы ліст.— Жыццё аджыў...
Дзе ёсць збавенне ад зямнога,
Ад ходу часу ракавога?!
Як дабрысці нам да парога,
Дзе Міг Вялікі — нам замнога,
А Вечнасць — сціслая дарога?!

Апалы ліст (другі) аджыў...

### ПРАЗРЭННЕ

У свеце вечнага няма.
Чаму ж, чаму душа жадае,
Каб не было канца і краю?
У свеце вечнага няма...
Навошта ўсе тады — не знаю.
Навошта гэтакі падман?

У свеце вечнага няма.
І след завеі замятаюць,
Старанна лепшае хаваюць.
Душу і розум мой мяняюць
І... самі чэзнуць, паміраюць.
Навошта ж гэтакі падман?

## Марына Куноўская

### ЛЮДИ ЦВЕТА ЗЕМЛИ

*I. КОГДА НА НЕБЕ СОЛНЦЕ*

*Та деревня ждала нас неизменной четвёртое лето:*
*над кленовой стеной поднимался сиреневый дым*
*и при свете зари — удивительно розовом свете —*
*шли косцы, улыбаясь, по дороге вдоль края воды.*

*В той деревне, наверно, жили люди и аисты в мире,*
*и на яблонях груши всех красивей и слаще росли.*
*Наши спины болели, было пасмурно, жарко и сыро,*
*но всегда оставались ее светлые окна вдали.*

*В той деревне, мы знали, только в белом ходили старухи,*
*а под вечер девчата пели песни прекрасней, чем жизнь,*
*и на каждой из крыш парень звезды срывал для подруги,*
*и лежали без дела по кладовкам большие ножи.*

*Та деревня тянулась за канавой у самого поля.*
*Мы работали рьяно, чтоб ступить до заката на гать.*
*Но кончался наш труд — и глаза закрывались невольно,*
*и в траву мы валились, не дойдя десять метров опять.*

*II. УСТАЛОСТЬ*

*Когда мы окончим работу — я останусь лежать на траве:*
*«Не скучай!» — проскрипят, разлетаясь по гнёздам, птицы,*
*будет утром роса по рукам, как по листьям, катиться,*
*и пчела прилетит на бровей моих рыжий свет.*
*Я останусь лежать — пусть в мой дом возвращаются дети*
*и садятся, как прежде, за длинный обеденный стол,*
*пусть разносит мой стог по соломинкам добрый ветер,*
*чтоб за каждую смог муравей ухватиться в потоп.*
*Я останусь лежать — и на сваях соснового леса —*
*мной не срубленных сваях — поднимется облачный дом,*
*и лучи свои солнце на холодных ветвях повесит*
*над поляной, покрытой от костра моего углем.*
*Крылья бабочек белых будут летом мне вместо век,*
*а зимою запомню все куплеты метельной песни,*
*и когда Командир закричит: «Ты спасёшься, воскресни!» —*
*я останусь лежать — мне приятно лежать на траве.*



## Іна Яцухна

### АНТЫЧНАЕ

Лук у руках Амура.
Качан повен меткіх стрэл.
У сэрцы сягоння бура,
А заўтра настане дзень,
Напоўніць усё сэнсам новым,
І больш не ўбачыш ты,
Як рвецца ў руках Амура
Шаўковая цеціва.

## Станіслаў Атамановіч

### САНЕТ

Ляжаць камені на раллі,
Бялеюць плямамі на глебе.
Іх шмат, іх больш, як зор у небе,
Таму дасюль іх не звялі —
Яны ўжо мохам парасллі.
Не мараць тут аб добрым хлебе,
Ламае плуг тут часта грэбель,
І зерне мучыцца ў зямлі.

Так у жыцці — праз кожны крок
Людская здрада ў рышток
Тваёй душы каменнем ляжа.
Вялікім смуткам у цішы
На ўспамін табе адкажа...
Ляжаць камені на душы.

